БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 070:654.19(476)(043.3)

**ПЯТКЕВІЧ**
**Вікторыя Міхайлаўна**

# МІЖНАРОДНАЕ ВЯШЧАННЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: СТРУКТУРА, СТРАТЭГІІ І МЕДЫЙНЫЯ ПРАКТЫКІ

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.10 – журналістыка

Мінск, 2020

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік – **Басава Ганна Іванаўна**,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
прафесар кафедры медыялінгвістыкі і
рэдагавання факультэта журналістыкі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Афіцыйныя апаненты: **Фральцова Ніна Ціханаўна**,
доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры медыялогіі
факультэта журналістыкі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Валькоўскі Міхаіл Аляксандравіч**,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Апаніруючая арганізацыя – Установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»

Абарона адбудзецца 24 лістапада 2020 г. у 14:00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.08 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Кальварыйская, д. 9 (корпус факультэта журналістыкі), аўд. 326. Тэлефон вучонага сакратара: (+375 17) 259-70-24.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «    » кастрычніка 2020 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт Л.П. Саянкова-Мельніцкая

# УВОДЗІНЫ

Узровень прагрэсіўнасці і перспектыўнасці грамадства і дзяржавы ў значнай ступені вызначаецца праз ступень развітасці інфармацыйнай інфраструктуры, што выяўляецца ў тэхналагічнай, сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай і культурнай сферах яе жыццядзейнасці. Фарміраванне і паспяховае функцыянаванне інфармацыйнага грамадства непасрэдным чынам уплываюць на яго здольнасць пазіцыянаваць сябе на міжнароднай арэне, у глабальнай прасторы. Інфармацыя ў такім выпадку з'яўляецца тым сродкам, праз які трансфармуецца інстытуцыйны дызайн публічнай сферы і змяняюцца дзейсныя формы самапазіцыянавання і рэалізацыі патрэб дзяржавы як паўнавартаснага ўдзельніка глабальных інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў.

Самастойнае і шматвектарнае развіццё дзяржавы прадугледжвае кірунак знешняй дзейнасці – міжнароднае медыяпазіцыянаванне. Неабходнасць трансліраваць афіцыйную пазіцыю і такім чынам уплываць на медыявобраз краіны выявілася ў хуткім часе пасля распрацоўкі і ўкаранення тэхнічных і тэхналагічных магчымасцей для арганізацыі аўдыяльнага або аўдыявізуальнага вяшчання на далёкія адлегласці. Буйныя медыяструктуры, як правіла, маюць у сваім складзе падраздзяленні, якія спецыялізуюцца на рабоце з замежнай аўдыторыяй, і Беларусь не з'яўляецца выключэннем. Так, у структуру Белтэлерадыёкампаніі ўваходзяць радыё «Беларусь» і тэлеканал «Беларусь 24», выдавецкі дом «Звязда» ўключае газету «Голас Радзімы», а «СБ. Беларусь сегодня» – газету «The Minsk Times», часопіс «Belarus. Беларусь». Акрамя таго, міжнароднае медыяпазіцыянаванне краіны адбываецца праз міждзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, сярод якіх – тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і міждзяржаўная тэлерадыёкампанія «Мир».

Стратэгія знешнепалітычнай дзейнасці незалежнай беларускай дзяржавы прадугледжвае інфармацыйны кампанент. Фарміраванне яе станоўчага вобраза адбываецца з дапамогай асобных падраздзяленняў органаў дзяржаўнай улады, найперш праз інфармацыйна-аналітычны аддзел Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і спецыялізаваныя аддзелы ў дыпламатычных прадстаўніцтвах Беларусі ў замежжы. Акрамя таго, міжнароднае вяшчанне – дзейсны спосаб кансалідаваць супольнасць выхадцаў з нашай краіны. Прыняты ў 2014 г. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб беларусах замежжа» рэгламентуе дзяржаўную палітыку адносна ўзаемадзеяння з беларусамі замежжа, ім прадугледжана садзейнічанне ў распаўсюджванні інфармацыі з Беларусі, у тым ліку на беларускай мове.

Такім чынам, функцыянаванне медыя, арыентаваных на замежную аўдыторыю, – гэта важны складнік у шматаспектнай дзейнасці па фарміраванні станоўчага вобраза дзяржавы як унутры, так і па-за яе межамі. Ва Усходняй Еўропе гэты працэс асабліва актывізаваўся пасля распаду СССР. Незалежныя краіны атрымалі

магчымасць выступаць самастойным і паўнавартасным суб'ектам на міжнароднай медыяарэне. У ХХI стагоддзі, калі інфармацыйныя абмены з'яўляюцца асновай для развіцця палітычных і іншых грамадскіх сувязей, камунікацыі фарміруюць і фармаціруюць культурна-палітычную прастору, мадэлюючы і перадаючы яе сутнасць.

*Актуальнасць тэмы даследавання* вынікае з узнікнення новых умоў і фактараў, якія аказваюць уплыў на пазіцыю беларускай дзяржавы ў сусветнай супольнасці, на ўспрыманне нашай краіны грамадскай думкай за мяжой, што выклікае неабходнасць у пастаянным вывучэнні гэтага зменлівага працэсу і, адпаведна, карэкціроўцы ключавых стратэгій стварэння медыявобраза краіны праз міжнароднае вяшчанне ў глабальнай інфармацыйнай прасторы.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Работа выканана ў каардынацыі з планавымі навуковымі тэмамі факультэта журналістыкі БДУ: кафедры міжнароднай журналістыкі «Эвалюцыя інтэграцыйнага патэнцыялу журналістыкі постсавецкіх краін у працэсе трансфармацыі агульнай еўразійска-атлантычнай інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы (2018–2022 гг., № дзяржрэгістрацыі 20180336); кафедры медыялогіі «Журналістыка як поліфункцыянальны інстытут сацыяльнай інтэграцыі: мультымедыйная і канвергентная парадыгмы» (2018–2022 гг., № дзяржрэгістрацыі 20180306); кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання «Функцыянаванне сродкаў масавай камунікацыі на сучасным этапе: камунікатыўны і рэдактарскі аспекты (2018–2022 гг., № дзяржрэгістрацыі 20180401); кафедры тэлебачання і радыёвяшчання «Эвалюцыя творчага патэнцыялу тэлебачання і радыёвяшчання ў працэсе трансфармацыі вытворчасці кантэнту аўдыявізуальных сродкаў масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь» (2018–2022 гг., № дзяржрэгістрацыі 20180337); кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі «Аксіялагічны патэнцыял беларускай журналістыкі ХХ–ХХI стст. і заканамернасці яго рэалізацыі ў нацыянальнай медыяпрасторы» (2018–2022 гг., № дзяржрэгістрацыі 20180333).

Тэма дысертацыі адпавядае прыярытэтным напрамкам даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гг., зацверджаных Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 190 ад 12.03.2015 г. (п. 11 «Грамадства і эканоміка», п. 12 «Міждысцыплінарныя даследаванні», п. 13 «Бяспека чалавека, грамадства і дзяржавы»).

**Мэта і задачы даследавання.** *Мэта* даследавання: устанавіць спецыфіку структурных пераўтварэнняў, стратэгій і медыйных практык міжнароднага вяшчання Рэспублікі Беларусь.

*Задачы* даследавання:

1. Ахарактарызаваць міжнароднае вяшчанне як сегмент нацыянальнай медыясістэмы;

2. Вызначыць тэарэтыка-метадалагічныя асновы і дэфінітыўныя катэгорыі міжнароднага вяшчання;

3. Выявіць перыяды станаўлення міжнароднага радыё- і тэлевяшчання ў Рэспубліцы Беларусь;

4. Вылучыць і сістэматызаваць тэматычныя прыярытэты міжнароднага радыё «Беларусь» у дыяхранічным зрэзе;

5. Раскрыць спецыфіку медыйнай актуалізацыі камунікатыўнай мадэлі арганізацыі аўдыяльных тэкстаў для замежнай аўдыторыі.

*Аб'ектам* даследавання з'яўляецца міжнароднае вяшчанне Рэспублікі Беларусь у сусветным інфармацыйным працэсе. *Прадмет даследавання* – структурныя пераўтварэнні, рэалізацыя стратэгій і медыйных практык міжнароднага вяшчання Рэспублікі Беларусь.

**Навуковая навізна.** Дысертацыя ўяўляе сабой першае комплекснае даследаванне міжнароднага вяшчання Рэспублікі Беларусь. У працы прадстаўлены генезіс міжнароднага вяшчання ў свеце і ў Беларусі на аснове архіўных матэрыялаў, большасць з якіх уводзіцца ў навуковы зварот упершыню; вызначаны этапы і асаблівасці развіцця гэтага віду СМІ ў Рэспубліцы Беларусь; у выніку дыскурс-аналізу абгрунтаваны форма і змест вяшчання; раскрыты працэс эвалюцыі фармату і выпрацаваны тэматычныя прыярытэты беларускага медыякантэнту для міжнароднай аўдыторыі на сучасным этапе. Значнасць атрыманых вынікаў заключаецца ў комплексным даследаванні камунікатыўных стратэгій міжнароднага вяшчання Рэспублікі Беларусь.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Міжнароднае вяшчанне з'яўляецца арганічным сегментам нацыянальнай медыясістэмы, важным інструментам дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі. Асаблівую ролю ў гэтым адыгрываюць фарматныя, тэхнічныя і тэхналагічныя сродкі, з дапамогай якіх выконваецца рэпрэзентатыўная функцыя дзяржавы. Кантэнт, арыентаваны на замежную аўдыторыю, пастаянна трансфармуецца ў залежнасці ад геапалітычнай сітуацыі і тэхніка-тэхналагічных магчымасцей. Фармат радыёвяшчання за мяжу праз кароткія, сярэднія і доўгія хвалі ўпершыню дазволіў аператыўна даводзіць інфармацыю да шырокай аўдыторыі без афіцыйнага пацвярджэння згоды краіны прыёму сігналу. Міжнароднае радыёвяшчанне, з аднаго боку, спрыяла павышэнню ўзроўню аб'ектыўнасці, з другога – фарміравала механізм інфармацыйнай «інтэрвенцыі» з замежжа. Развіццё глабальнага доступу да інфармацыі трансфармавала, але не выключыла фармат міжнароднага вяшчання, якое па-ранейшаму застаецца прэрагатывай дзяржавы, што абумоўлівае ўнікальнасць камунікатыўнай мэты гэтага медыясегмента. Інфармацыйныя

тэхналогіі XXI стагоддзя дыктуюць камбінаванае выкарыстанне спосабаў трансляцыі інфармацыі, што робіць дзейнасць міжнароднага вяшчання больш свабоднай і рухомай, а яго кантэнт ператварае ў цэласны мультымедыйны прадукт.

2. Катэгарыяльны апарат даследавання міжнароднага вяшчання ўключае ў сябе традыцыйныя і новыя дэфініцыі, якія абумоўлены інтэнсіўным развіццём інфармацыйных тэхналогій, і канцэптуалізуюцца праз станоўчы медыявобраз краіны. Эфектыўны кантэнт, скіраваны на фарміраванне медыявобраза краіны за мяжой, выконвае функцыю рэпрэзентацыі дзяржавы, рэалізацыя якой залежыць ад комплексу палітычных, эканамічных, сацыяльных, культурных фактараў. Міжнароднае вяшчанне ажыццяўляе сваю дзейнасць на аснове суб'ект-суб'ектнай мадэлі, калі слухач/глядач становіцца паўнапраўным удзельнікам дыялагічнай камунікатыўнай прасторы. Метад «мяккай сілы» прадугледжвае пераход ад інвектыўна-маніпулятыўных тэхналогій да канвенцыянальных; праз шматстайныя дыялагічныя формы ўзаемадзеяння суб'ектаў фарміруецца характар медыятворчасці, акрэсліваюцца найбольш запатрабаваныя тэматычныя кірункі і падтрымліваецца канструктыўны дыялог.

3. Міжнароднае вяшчанне Рэспублікі Беларусь уключае два ключавыя суб'екты: радыё «Беларусь» і тэлеканал «Беларусь 24». У функцыянаванні радыё «Беларусь» выдзяляюцца пяць ключавых перыядаў: савецкі, пераходны, перыяд актыўнага ўвядзення новых моў вяшчання, перыяд павелічэння аб'ёму вяшчання і мультымедыйны. У станаўленні тэлеканала «Беларусь 24» вылучаюцца чатыры перыяды: падрыхтоўчы, пілотны, перыяд актыўнай вытворчасці арыгінальнага (уласнага) кантэнту, мультымедыйны. Развіццё радыё «Беларусь» абумоўліваецца пашырэннем вяшчальнай сеткі найперш за кошт уключэння новых моў вяшчання (па стане на верасень 2020 г. – 9 моў), у той час як тэлевытворчасць на канале «Беларусь 24» арганізавана на дзяржаўных мовах Рэспублікі Беларусь, за выключэннем абмежаванага па часе інфармацыйнага кантэнту на англійскай мове.

4. Тэматыка кантэнту і мэтавая прэзентацыя нацыянальнай самабытнасці і адметнасці ў міжнародных аўдыявізуальных СМІ істотна ўплывае на наладжванне знешнеэканамічных, палітычных, культурных сувязей, пазіцыянаванне «малых» культур і моў на глабальным узроўні. Нацыянальная ідэнтычнасць як комплекснае і глыбіннае паняцце менталітэту выступае асноватворным і ключавым складнікам міжнароднага вяшчання. Праблемна-тэматычная сфера міжнароднага вяшчання зыходзіць з канцэпту *Беларусь*, з'яўляецца беларусацэнтрычнай: кантэнт скіраваны на падзеі, з'явы, каментарыі, якія рознааспектна пазіцыянуюць беларускія рэаліі. Пры гэтым беларусацэнтрычнасць праяўляецца ў праграмах не толькі культуралагічнага, але і палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага характару.

5. У адпаведнасці з камунікатыўнай стратэгіяй у медыявытворчасці радыё «Беларусь» мадэлююцца структура, форма і змест журналісцкіх тэкстаў,

прызначаных для міжнароднай аўдыторыі. Інтэнцыянальная скіраванасць маўлення з'яўляецца адным з фактараў, з дапамогай якога канструюецца медыявобраз, адлюстроўваюцца прыярытэтныя кірункі жыццядзейнасці краіны і функцыянавання дзяржавы. Медыйная актуалізацыя станоўчага вобраза адбываецца ў эфірным маўленні як на лексічным, так і на марфолага-сінтаксічным, кампазіцыйным узроўнях, праз якія не толькі транслюецца сэнс выказвання, але і рэалізуюцца камунікатыўныя задачы медыяпрадукту для замежнай аўдыторыі.

**Эмпірычнай базай** даследавання паслужылі матэрыялы Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, у якіх адлюстравана гісторыя развіцця радыё «Беларусь» (1991–2020 гг.) і спадарожнікавага тэлеканала «Беларусь 24» (2004–2020 гг.): штатныя расклады Белтэлерадыёкампаніі і падведамасных арганізацый за 1996–2013 гг. (11 архіўных кніг, 48 лістоў); даведкі, інфармацыя ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь па пытаннях вяшчання за 1996–2003 гг. (11 архіўных кніг, 221 ліст); даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па пытаннях вяшчання і дакументы аб іх выкананні (пратаколы, даведкі, інфармацыі) за 2005–2014 гг. (10 архіўных кніг, 150 лістоў); пратаколы пасяджэнняў калегій Белтэлерадыёкампаніі і дакументы да іх за 1997–2011 гг. (12 архіўных кніг, 387 лістоў); загады старшыні Белтэлерадыёкампаніі па асноўнай дзейнасці за 2003 г. (2 архіўныя кнігі, 17 лістоў).

Фактычным матэрыялам для кантэнт-аналізу стаў поўны тыднёвы цыкл вяшчання радыё «Беларусь» на беларускай, рускай і англійскай мовах (выбарачная сукупнасць – 112 эфірных гадзін). Эмпірычнай базай для дыскурс-аналізу эфіру радыё «Беларусь» паслужылі тэксты перадач за 1992–1995 гг. (21 архіўная кніга, 2190 лістоў), а таксама выбарачныя аўдыязапісы эфірных элементаў за 2012–2020 гг. (агульны хранаметраж склаў 1920 гадзін, з якіх – 800 аўтарскіх) і матэрыялы, размешчаныя на афіцыйным сайце радыё «Беларусь» за апошнія 8 гадоў.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені.** Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем, выкананым на аснове комплекснага аналізу навуковай літаратуры, першакрыніц, заканадаўчых і нарматыўных актаў Рэспублікі Беларусь, эфірных матэрыялаў, архіўных дакументаў, большасць з якіх уведзена ў навуковы зварот упершыню.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў** заключаецца ў тым, што тэарэтычныя распрацоўкі і практычныя рэкамендацыі могуць быць выкарыстаны ў далейшым вывучэнні творчай практыкі і функцыянальнай дзейнасці аўдыявізуальных медыя; у вытворчай дзейнасці беларускіх радыё- і тэлеканала, скіраванай на ўдасканаленне стратэгій функцыянавання; у навучальным працэсе –

пры выкладанні дысцыплін па методыцы тэле- і радыёжурналістыкі, асновах творчай дзейнасці журналіста-міжнародніка і інш. Апублікаваныя вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны ў якасці метадычнай базы для практычнай дзейнасці спецыялізаваных аўдыявізуальных СМІ.

**Апрабацыя вынікаў даследавання.** Асноўная канцэпцыя, тэарэтычныя высновы, выкладзеныя ў рабоце, абмяркоўваліся на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, круглых сталах, семінарах: 16-я Рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя маладых вучоных (Брэст, 2014); Рэспубліканская навукова-практычная студэнцкая канферэнцыя «Журналістыка – славеснасць – культура: погляд маладых даследчыкаў» (Брэст, 2014); 17–21-я Міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі «Журналістыка: стан, праблемы, перспектывы» (Мінск, 2013–2019 гг.); 6-я Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Кітайская цывілізацыя ў дыялогу культур» (Мінск, 2015); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Журналістыка XXI стагоддзя: традыцыі і выклікі новага часу» (Мінск, 2016); Міжнародныя маладзёжныя навуковыя форумы «Ламаносаў» (Масква, 2014, 2016, 2019); 15–16-я Міжнародныя канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў «Медыя ў сучасным свеце. Маладыя даследчыкі» (Санкт-Пецярбург, 2016–2017 гг.); 5-я Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Міжнародная журналістыка–2016: турбулентнасць міждзяржаўных адносін і медыя» (Мінск, 2016); 8-я Міжнародная навуковая канферэнцыя «Мова – літаратура – культура (да 90-годдзя з дня нараджэння прафесара Л.М. Шакуна)» (Мінск, 2016); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Сучасная медыясфера: практыка трансфармацыі, тэарэтычнае асэнсаванне, інстытуцыйныя перспектывы» (Мінск, 2017); 2-я Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Мова ў каардынатах масмедыя» (Санкт-Пецярбург, 2017); 6-я Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Міжнародная журналістыка–2017: ідэя інтэграцыі інтэграцый і медыя» (Мінск, 2017); Міжнародны круглы стол «Прафесійная камунікатыўная асоба ў інстытуцыйных дыскурсах» (Мінск, 2018); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Аўдыявізуальныя медыя ва ўмовах трансфармацыі сацыякультурнага асяроддзя» (Мінск, 2019).

Навуковыя высновы даследавання рэалізаваны ў вытворчым і адукацыйным працэсах, што пацвярджаецца актамі ўкаранення ў вучэбны працэс факультэта журналістыкі БДУ і практычную дзейнасць Галоўнай дырэкцыі міжнароднага вяшчання (радыё «Беларусь») Беларускага радыё. Шэраг напрацовак апрабіраваны аўтарам даследавання ў непасрэднай прафесійнай дзейнасці ў якасці рэдактара аддзела інфармацыйных, грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных праграм міжнароднага радыё «Беларусь» (з 2012 г. па 2020 г.).

Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца аўтарам пры выкладанні вучэбных

дысцыплін на I і II ступенях навучання на факультэце журналістыкі БДУ: «Асновы творчай дзейнасці журналіста-міжнародніка», «Міжкультурная камунікацыя і СМІ», «Дзелавая камунікацыя», «Невербальная камунікацыя ў журналістыцы», «Журналісцкае майстэрства». Асноўныя вынікі былі адлюстраваны ў падрыхтаваным (у суаўтарстве) вучэбным дапаможніку «Невербальная камунікацыя ў журналістыцы (з электронным дадаткам)» (Мінск, 2017) з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

На рэалізацыю праекта «Метады і сродкі канструявання медыявобраза краіны ў эфіры міжнароднага радыё "Беларусь"» быў атрыманы грант для студэнтаў і аспірантаў БДУ на 2015 г. За комплекснае даследаванне міжнароднага радыё- і тэлевяшчання Рэспублікі Беларусь дысертанту была прызначана стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 2019 г.

Вынікі па тэме дысертацыйнага даследавання былі паспяхова прадстаўлены на шэрагу конкурсаў навукова-даследчых прац: Усерасійскі конкурс навуковых прац у секцыі «Журналістыка», арганізаваны «Вышэйшай школай журналістыкі і масавых камунікацый» Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта (2014 г., прысуджана званне пераможцы за працу «Речевые стратегии формирования медиаобраза страны (на примере контента международного радио "Беларусь")»); XX Рэспубліканскі конкурс навуковых прац студэнтаў (2014 г., прысуджана другая катэгорыя за працу «Сродкі маўленчага ўздзеяння ў міжнародным радыёвяшчанні (на прыкладзе радыё "Беларусь")»); XXI Рэспубліканскі конкурс навуковых прац студэнтаў (2015 г., прысуджана першая катэгорыя за працу «Імідж краіны ў міжнародным радыёвяшчанні: інтэрнэт-вяшчанне радыё "Беларусь" на беларускай мове»); XXII Рэспубліканскі конкурс навуковых прац студэнтаў (2016 г., прысуджана званне лаўрэата за працу «Міжнароднае вяшчанне ў глабальнай інфармацыйнай прасторы: айчынны і замежны вопыт»).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Па тэме дысертацыі апублікавана 35 навуковых прац, у тым ліку 4 артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах (2 аўт. арк.), 8 артыкулаў у зборніках навуковых прац (3 аўт. арк.), 23 публікацыі ў зборніках матэрыялаў рэспубліканскіх і міжнародных навукова-практычных канферэнцый (5 аўт. арк.). Агульны аб'ём публікацый – 10 аўт. арк.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса (які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (195 пазіцый) і спіс публікацый саіскальніка (35 пазіцый)) і дадаткаў. Агульны аб'ём даследавання – 225 старонак, асноўны тэкст займае 140 старонак, бібліяграфічны спіс – 22 старонкі, дадаткі – 63 старонкі.

# АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

У **першай главе «Міжнароднае вяшчанне як сегмент нацыянальнай медыясістэмы»** праведзены аналітычны агляд айчынных і замежных даследаванняў, прысвечаных міжнароднаму вяшчанню, выяўлены перспектыўныя і канцэптуальна значныя для дысертацыі тэарэтыка-метадалагічныя падыходы, апісаны ключавыя дэфінітыўныя катэгорыі.

У **раздзеле 1.1 «Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы і дэфінітыўныя катэгорыі»** разглядаюцца два ключавыя этапы развіцця міжнароднага вяшчання: першы атаясамліваецца з «халоднай вайной», другі – з утварэннем і развіццём постсавецкага шматпалярнага грамадства. У кожным з іх выкарыстоўваліся розныя канцэпцыі вяшчання, што адпаведным чынам знайшло сваё адлюстраванне ў навукова-даследчых працах.

Абазначаны падыходы даследчыкаў савецкага перыяду (Б.Г. Баннаў, Р.М. Вачнадзэ, С.М. Галякоў, А.Ф. Панфілаў, Я.Р. Радкевіч, В.М. Ярашэнка і інш.), якія галоўным чынам выявіліся праз вывучэнне форм, метадаў і ступені эфектыўнасці двухбаковай прапаганды, апісанне метафарызаванага вобраза ворага («чужыя галасы», радыёвайна, псіхалагічная вайна). Паказана трансфармацыя навуковага асэнсавання замежнага вяшчання, якая пачалася ў 1990-х гг. і працягваецца да цяперашняга часу. Праз інтэрпрэтацыю даследаванняў апошніх трох дзесяцігоддзяў (Ю.Я. Афанасьеў, С.Б. Беражкова, У.К. Іардан, Л.У. Іваніцкая, Г.С. Колчына, В.У. Манастырова, Д.А. Мірыманаў, І. Нааваф, А.М. Саламацін, А.А. Шэрэль і інш.) прадстаўлена шматвектарнасць з’явы міжнароднага вяшчання ў філалагічным, палітычным, культуралагічным рэчышчах (сістэма міжнароднага вяшчання; міжнароднае вяшчанне як сацыякультурны феномен; канцэпцыя, праблемна-тэматычная структура, інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі, жанравыя асаблівасці сучаснага вяшчання на замежныя краіны; фарміраванне і пазіцыянаванне вобраза краіны праз міжнароднае вяшчанне). Міжнароднае вяшчанне як частка аўдыяльнай і аўдыявізуальнай сістэмы сродкаў масавай інфармацыі Беларусі ў гістарычным, грамадска-палітычным і сацыякультурным кантэксце айчыннай медыяпрасторы выяўлены праз сістэмнае вывучэнне прац такіх даследчыкаў, як В.Р. Булацкі, В.П. Вараб’ёў, Т.М. Дасаева, Л.І. Мельнікава, А.А. Плаўнік, І.І. Сачанка, А.Г. Слука, Н.Ц. Фральцова, В.Г. Шадурскі, В.М. Шэін, Д.Л. Яканюк і інш.

У якасці асноватворнага метаду даследавання міжнароднага вяшчання абазначаны дыскурс-аналіз (Т. ван Дэйк, В.І. Іўчанкаў, Я.А. Кажамякін, Дж. Крэры, І.І. Токарава, І.Ф. Ухванава-Шмыгава), які дазваляе з улікам сацыяльных, культурных, структурных характарыстык у комплексе адлюстраваць асаблівасці ўзаемадзеяння грамадства і дзяржавы (у тым ліку з замежнай аўдыторыяй на макраўзроўні).

Праведзены супастаўляльны аналіз паняццяў *вобраз* і *імідж* у кантэксце міжнароднага вяшчання. Абгрунтавана мэтазгоднасць выкарыстання паняцця *вобраз* (вобраз як рэальнасць, якая ўзнаўляецца на аснове медыякарціны свету) і абазначана рэлевантнасць паняцця *імідж* тэме даследавання з улікам камунікатыўнай мэты міжнароднага вяшчання. На міжнароднае вяшчанне спраектаваны механізмы стварэння медыявобраза як вобраза «другой рэальнасці» (Ю.У. Белавусава), абазначана тэхналогія фарміравання фрэйміраванага канструкта, пабудова якога выяўляецца праз рэалізацыю камунікатыўнай мэты міжнароднага вяшчальніка.

У **раздзеле 1.2 «Вяшчанне на замежжа як сродак рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі»** абгрунтавана мэтазгоднасць фарміравання знешняга медыявобраза краіны праз рэалізацыю ключавых стратэгій: стратэгіі мадэлявання, іміджавай стратэгіі, кантэнт-стратэгіі і камунікатыўнай стратэгіі і эфектыўнасць іх выкарыстання ў рэдакцыйнай палітыцы міжнароднага вяшчальніка.

Устаноўлены механізмы самапазіцыянавання дзяржавы для рэалізацыі яе шматвектарнай знешняй палітыкі ў глабальнай прасторы, выяўлены спосабы фарміравання вобраза краіны праз медыярэсурсы.

Прасочана эвалюцыя інтэрпрэтацый знешняй інфармацыйнай дзейнасці дзяржавы ад прапаганды да «публічнай дыпламатыі» або «медыйнай дыпламатыі». Апісаны механізмы выкарыстання «мяккай сілы» ў працэсе стварэння медыявобраза краіны, абгрунтавана суаднесенасць сучаснага міжнароднага вяшчання са сферай уплыву гэтай формы палітычнай улады.

Апісаны ўплыў існуючых «інфармацыйных супермагістралей» (Р.М. Вачнадзэ, Дж. Гербнер, Л.М. Зямлянава, Г.М. Маклюэн, У.Л. Шрам), для даследаванняў якіх характэрны аб’яднанне інфармацыйных сегментаў у глабальнай сетцы і змяненне інфраструктуры СМІ, у выніку чаго ўзнікаюць і імкліва пашыраюцца мультымедыйныя тэхналогіі.

Стратэгія мадэлявання абумоўлена неабходнасцю выпрацаванага, паслядоўнага і аптымальнага выкарыстання матэрыяльных, фінансавых, чалавечых, інтэлектуальных рэсурсаў для фарміравання канструктыўнага вобраза краіны. Іміджавая стратэгія спецыялізаваных на пазіцыянаванні дзяржавы за мяжой СМІ разлічана на адносна працяглы перыяд (25–30 гадоў) і накіравана на фарміраванне ўстойлівага станоўчага ўнутры- і знешнепалітычнага ўспрымання краіны. Кантэнт-стратэгія вызначае асаблівасці выкарыстання кантэнту для дасягнення пастаўленай мэты, яго адпаведнасць запатрабаванням замежнай аўдыторыі. Камунікатыўная стратэгія дазваляе мадэляваць структуру і форму медыятэкстаў, прызначаных для міжнароднай аўдыторыі. Абазначаны наяўнасць канвенцыянальнай і маніпулятыўнай (у большай ступені характэрна для прапагандысцкіх каналаў) камунікатыўных стратэгій і іх актыўнае выкарыстанне ў міжнародным медыяэфіры.

У **другой главе «Структура міжнароднага вяшчання Рэспублікі Беларусь»** апісаны ключавыя перыяды развіцця аўдыяльнага і аўдыявізуальнага вяшчання на замежныя краіны і іх асаблівасці.

У **раздзеле 2.1 «Эвалюцыя функцыянавання вяшчання на замежныя краіны»** вызначана роля міжнароднага вяшчання на розных этапах яго развіцця. Абазначана спецыфічнасць характэрных для гэтага віду СМІ мэтавых груп (суайчыннікі, якія часова знаходзяцца за мяжой; прадстаўнікі нацыянальнай дыяспары; жыхары саюзных і падкантрольных тэрыторый; іншыя зацікаўленыя асобы) і асноўныя этапы развіцця радыё- і тэлевяшчання на замежжа. Вывучаны тэхнічныя і тэхналагічныя ўласцівасці традыцыйнага спосабу міжнароднага радыёвяшчання праз кароткія, сярэднія і доўгія хвалі. Абазначаны кірункі трансфармацыі аўдыяльных СМІ ў XXI стагоддзі: з уласна аўдыяльнага канала распаўсюджвання інфармацыі да аўдыявізуальнага і мультымедыйнага.

Ахарактарызаваны найбольш развітыя і рэйтынгавыя міжнародныя вяшчальнікі (Вялікабрытанія, Францыя, Германія, ЗША, Расія, Кітай, Іран). На канкрэтных прыкладах абгрунтавана актуальнасць міжнароднага вяшчання ў XX і XXI стагоддзях, прычыны яго захавання як асобнага сегмента ў нацыянальнай сістэме СМІ дзяржавы. Прасочваецца генезіс міжнароднага вяшчання ў глабальным сацыякультурным кантэксце па наступных крытэрыях: стратэгіі дзейнасці, фокус вяшчання, спосабы вяшчання, аб'ём вяшчання.

У **раздзеле 2.2 «Міжнароднае радыё «Беларусь»: перыядызацыя і этапы развіцця»** прадстаўлены вынікі апрацаваных архіўных матэрыялаў за 1991–2015 гг., а таксама экспертных інтэрв'ю з Н.В. Хлебус (працавала на радыёстанцыі «Беларусь» у 1980–2003 гг. на розных пасадах, у тым ліку і дырэктара), Юргенам Эберхартам (супрацоўнік нямецкамоўнай службы радыёстанцыі «Беларусь» у 1985–2003 гг.), Н.Л. Баўкалавай (рэдактар радыёстанцыі «Беларусь» у 1980–2003 гг.), Н.Я. Гальпяровічам (галоўны дырэктар Галоўнай дырэкцыі міжнароднага вяшчання Беларускага радыё ў 2004–2018 гг.).

Вызначана і абгрунтавана перыядызацыя дзейнасці радыё «Беларусь» з моманту яго стварэння (1962 г.). На падставе найбольш істотных і канцэптуальных змен у працы гэтай структуры выдзелена пяць ключавых перыядаў функцыянавання радыё: 1) савецкі (1962–1985 гг.); 2) пераходны (1986–1996 гг.); 3) перыяд актыўнага ўвядзення новых моў вяшчання (1997–2004 гг.); 4) перыяд павелічэння аб'ёму вяшчання (2005–2012 гг.); 5) мультымедыйны (з 2013 г.).

У адпаведнасці з вылучанымі перыядамі сістэматызавана інфармацыя пра ключавыя характарыстыкі і працэсы дзейнасці міжнароднага радыё. Адлюстравана паступовае павелічэнне аб'ёму вяшчання з 30 хвілін у суткі да кругласутачнага на розных платформах (праз інтэрнэт, спадарожнік, FM-перадатчыкі), вылучаны асаблівасці мадэлявання эфірнай сеткі. Моўная палітыка і геаграфія вяшчання радыё

суаднесена з геапалітычнымі інтарэсамі Рэспублікі Беларусь, абгрунтавана неабходнасць вытворчасці кантэнту на дзевяці мовах і акрэслены дакладны аб’ём вяшчання на кожнай з іх у той ці іншы перыяд дзейнасці. Указаны трансфармацыі штатнага раскладу ў адпаведнасці з актуальнымі патрэбамі рэдакцыі. Абазначаны перспектыўныя кірункі развіцця міжнароднага радыё.

У **раздзеле 2.3 «Тэлеканал “Беларусь 24” як медыйны інструмент у сістэме міжнароднага вяшчання»** на аснове нарматыўных актаў, пратаколаў пасяджэнняў калегій, загадаў і іншых дакументаў апісаны працэс стварэння, станаўлення і развіцця тэлеканала «Беларусь 24», распрацавана перыядызацыя. Выяўлены адміністрацыйныя, прававыя, арганізацыйныя працэдуры арганізацыі ў Рэспубліцы Беларусь тэлевяшчання на замежныя краіны (падрыхтоўчы перыяд, 1993–2004 гг.); адлюстравана канцэпцыя і элементы вяшчальнай сеткі тэлеканала «Беларусь-ТБ» у пілотным перыядзе (2004–2005 гг.); прадстаўлена характарыстыка міжнароднага тэлеэфіру ў перыяд інтэнсіўнага развіцця (2006–2012 гг.), для якога характэрна паступовая колькасная і якасная трансфармацыя кантэнту ў адпаведнасці з запытамі мэтавай аўдыторыі і вынікамі сацыялагічных даследаванняў. Пачаткам сучаснага, мультымедыйнага, перыяду лічыцца 2013 г., калі адбыўся рэбрэндынг тэлеканалаў Белтэлерадыёкампаніі, у выніку якога краіну ў міжнародным эфіры прадстаўляе тэлеканал «Беларусь 24». Адзначаецца пашырэнне аб’ёму арыгінальнага кантэнту на рускай, беларускай, англійскай мовах і больш актыўная яго адаптацыя ў інтэрнэт-асяроддзі.

Адлюстравана дзейнасць Дырэкцыі міжнародных сувязей і Дырэкцыі інтэрнэт-вяшчання Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь у рэчышчы папулярызацыі краіны сярод шырокай глабальнай аўдыторыі. Вызначаны фарматы дзейнасці тэлеканала «Беларусь 24» і Белтэлерадыёкампаніі ў цэлым у складзе міжнародных арганізацый з мэтай пашырэння супрацоўніцтва, папулярызацыі тэлеканала і правядзення сацыялагічных даследаванняў для вызначэння глядацкага рэйтынга. Апісаны іншыя формы распаўсюджвання аўдыявізуальнага кантэнту пра Беларусь у замежжы (рэтрансляцыя, кааперацыя для вытворчасці сумесных праектаў, стварэнне інфанагод, удзел у профільных выстаўках і г.д.).

У **трэцяй главе «Медыйныя практыкі міжнароднага радыё “Беларусь”»** даследаваны інфармацыйныя, інфармацыйна-аналітычныя і тэматычныя выпускі на міжнародным радыё «Беларусь», вызначана ступень эфектыўнасці выкарыстання кантэнт-стратэгіі ў вяшчальнай сетцы і камунікатыўнай стратэгіі ў эфірным маўленні.

У **раздзеле 3.1 «Тэматычнае поле беларускага кантэнту для міжнароднай аўдыторыі на этапе станаўлення дзяржаўнасці (1991–2000 гг.)»** на падставе вяшчальнай сеткі перыяду фарміравання незалежных дзяржаўных інстытутаў

(першае дзесяцігоддзе існавання Рэспублікі Беларусь) паказаны запатрабаваныя і частотныя тэматычныя кірункі ў палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і культурнай сферах: дзейнасць палітычных партый, рэлігійнае жыццё, экалогія, гендарныя пытанні, беларуская дыяспара і інш. Формы канструявання медыятэкстаў у 1990-я гг. і тэматычная разнастайнасць у перыяд станаўлення незалежнасці краіны пацверджаны архіўнымі матэрыяламі. Паказаны адрозненні медыякантэнту для ўнутранай і знешняй аўдыторыі. Рэканструявана структура праграмных блокаў беларуска- і нямецкамоўнага вяшчання (навіны, рэпартажы, каментарыі, агляды, дыктарскія рэмаркі, музычны і літаратурна-мастацкі блокі).

Вызначаны прыярытэтныя тэматычныя кірункі радыёстанцыі «Беларусь» таго часу, сярод якіх: знешнепалітычная дзейнасць маладой дзяржавы; матэрыялы, скіраваныя на ўмацаванне кансэнсусу і кансалідацыі ў грамадстве; матэрыялы, якія спрыяюць пераадоленню і мінімізацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы; матэрыялы, скіраваныя на адраджэнне шматвяковай нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Увасабленне гэтых прыярытэтаў адбывалася ў адпаведных блоках – інфармацыйным («Весткі з Бацькаўшчыны», «Беларусь сёння», «Інфармацыйны калейдаскоп» і інш.) і тэматычным (аналітычным) («Беларусь на шляху рэформ: праблемы і рашэнні», «Дзеля пераадолення наступстваў Чарнобыля», «Рэспубліка Беларусь і сусветная садружнасць», «Сустрэчы. Дыялог. Супрацоўніцтва», «Спадчына», «Родны край: старонкі гісторыі», «Клуб слухачоў», «Агледзіны талентаў Беларусі» і інш.).

Абазначана арганізацыя эфіру нямецкамоўнага вяшчання радыёстанцыі «Беларусь», з якой пачалося вяшчанне на замежных мовах. У тыднёвы расклад уваходзілі такія праграмы, як «Калейдаскоп» або «Спадчына» (навіны, інтэрв'ю з прадстаўнкамі сацыяльна-культурнай сферы, музычны блок), «Сябрына» (праграма, прысвечаная моладзі), «Клуб слухачоў» (адказы на пытанні з рэдакцыйнай пошты), «Кантакты – дыялог – супрацоўніцтва» (рэпартажы і інтэрв'ю, у якіх раскрываюцца вектары міжнароднага развіцця Рэспублікі Беларусь).

У **раздзеле 3.2 «Медыйныя прыярытэты беларускага кантэнту для міжнароднай аўдыторыі на сучасным этапе»** прадстаўлены вынікі кантэнт-аналізу тыднёвага цыкла вяшчання радыё «Беларусь» на беларускай, рускай і англійскай мовах (112 эфірных гадзін). Аналіз паводле тэматычнай дыферэнцыяцыі (палітыка, эканоміка, сацыяльная сфера, культура) паказаў, што ў эфіры пераважаюць навіны, якія раскрываюць жыццё беларускага соцыуму (38 %), паведамленні пра культуру займаюць 24 %, пра эканамічную сітуацыю краіны гаворыцца ў 24 % паведамленняў, пра палітычную – у 15 %. Разнастайная тэматыка навін на міжнародным радыё ў першую чаргу адлюстроўвае шырокае кола двухбаковых і шматбаковых кантактаў Беларусі з іншымі краінамі.

Выяўлена, што вяшчанне на беларускай мове паводле тэматыкі

размяркоўваецца наступным чынам: перадачы на палітычную тэматыку займаюць 5 % эфіру (2 перадачы), эканамічнай тэматыцы адведзена 9 % эфірнага часу (4 перадачы), сацыяльная тэма дамінуе ў 7 перадачах (15 % эфіру). Дзве перадачы (5 % эфіру) паводле тэматыкі ідэнтыфікуюцца як «Living Belarus» (перадачы «Розгалас» і «Агляд прэсы»). Найбольш поўна ў тэматычным вяшчанні прадстаўлена культурнае жыццё Беларусі – 29 перадач (65 % эфірнага часу).

Вынікі кантэнт-аналізу паказалі, што рускамоўнае вяшчанне адрозніваецца больш высокім узроўнем распрацаванасці палітычнай тэматыкі (22,5 % эфірнага часу), эканоміка займае 10 % эфіру, сацыяльная сфера – 22,5 %, living – 5 %. 40 % эфірных матэрыялаў звязана з культурнай тэматыкай. Палову эфірнага часу гэта тэматыка займае ў вяшчальнай сетцы радыё «Беларусь» на англійскай мове. Палітыцы адводзіцца 9 %, эканоміцы – 14 %, сацыяльнай сферы – 20 % эфірнага часу. Да катэгорыі «Living» аднесена 7 % эфіру.

Выпрацавана актуальная мадэль прадстаўленасці тэматычных кірункаў у вяшчанні на розных мовах. Адлюстравана дамінаванне і абгрунтавана неабходнасць у эфіры праграм, якія выяўляюць нацыянальную ідэнтычнасць беларусаў, звяртаюцца да гістарычных сведчанняў фарміравання беларускай нацыі, асвятляюць культурныя патэрны, выяўляюць актуальны культурны ландшафт, у тым ліку праз матэрыялы на палітычную, эканамічную і сацыяльную тэмы.

У **раздзеле 3.3 «Камунікатыўная стратэгія ў арганізацыі медыякантэнту міжнароднага радыё "Беларусь"»** даследаваны маўленчыя жанры (паводле М.М. Бахціна) і лексічныя, марфолага-сінтаксічныя, кампазіцыйныя асаблівасці маўлення ў радыёэфіры. Радыёматэрыял аналізуецца як набор першасных жанравых мікраформ (навіна, легенда, урок, даведка, рэпліка і г.д.), вызначаюцца іх камбінацыі (другасныя жанравыя формы), праз якія вызначаецца механізм рэалізацыі і інтэрпрэтацыі інфармацыйнай нагоды журналістамі і ўключэнне праз яго культурных канцэптаў.

Выпрацаваны прыёмы эфектыўнай маўленчай стратэгіі ў дачыненні да замежнай аўдыторыі. Для выяўлення канвенцыянальных і маніпулятыўных прыёмаў выкарыстана мадэль маўленчых актаў, якая прадугледжвае разгляд маўленчай плыні як лакутыўнага, ілакутыўнага і перлакутыўнага актаў.

Камунікатыўная дзейнасць удзельнікаў эфіру разглядаецца ў кантэксце тэорыі маўленчых актаў Дж. Осціна, паводле якой у любым выказванні вербалізуецца не толькі прамы сэнс, але і пазамаўленчая, ілакутыўная мэта. Праяўленне гэтай мэты адлюстравана праз пэўныя асаблівасці маўленння ў міжнародным эфіры на трох узроўнях: лексічным (рэгулярнасць выкарыстання пэўных лексем, сярод якіх назва краіны, стэрэатыпізаваныя характарыстыкі беларусаў і Беларусі і г.д.), марфолага-сінтаксічным (словаўтваральныя сродкі (суфіксы,канчаткі), формы займеннікаў і інш., пры дапамозе якіх падкрэсліваецца і перадаецца першасная роля Беларусі ў

двух- ці шматбаковых узаемадзеяннях); кампазіцыйным (канструяванне і выкарыстанне розных тыпаў сказаў і прынцыпаў пабудовы тэксту для падкрэслівання і ўзмацнення пазітыўных характарыстык краіны і яе грамадзян).

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Пазіцыянаванне краіны за мяжой і фарміраванне яе прадуманага і станоўчага медыявобраза з'яўляецца абавязковым складнікам дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі. Вяшчанне на замежныя краіны застаецца прэрагатывай дзяржавы безадносна да дзеючага палітычнага ладу і існуючай сістэмы сродкаў масавай інфармацыі. Кантэнт, які выяўляе колькасны і якасны ўзровень прысутнасці краіны ў медыяпрасторы, выступае важным паказчыкам ступені яе развітасці і аўтарытэту на міжнароднай арэне. З гэтага вынікае неабходнасць у распрацоўцы, фарміраванні і арганізацыі адаптаванай для замежнага карыстальніка мадэлі медыявобраза, якая знаходзіцца ў пастаяннай трансфармацыі адпаведна актуальным тэхнічным і тэхналагічным магчымасцям і ў залежнасці ад геапалітычнай сітуацыі.

Мэтанакіраванае пазіцыянаванне краіны для масавай замежнай аўдыторыі ўпершыню стала неад'емным кірункам інфармацыйнай дзейнасці ў першай палове XX стагоддзя ва ўмовах ідэалагічнага супрацьстаяння. Выражаная тэндэнцыйнасць трансфармавалася ў канструктыўнае выкарыстанне камунікатыўных рэсурсаў для эфектыўнага фарміравання медыявобраза пачынаючы з 1990-х гг. Узнікненне «інфармацыйных супермагістралей» выклікала аб'яднанне розных сегментаў у глабальнай сетцы і змяненне інфраструктуры СМІ, пераход да мультымедыйнага фармату дзейнасці. Актуальная ў цяперашні час мадэль міжнароднага вяшчання прадугледжвае ўзаемадзеянне аўдыяльных, аўдыявізуальных і інтэрнэт-сродкаў распаўсюджвання інфармацыі, што стымулюе выкарыстанне новых падыходаў да стварэння кантэнту ва ўмовах дыялагічнасці, шматвектарнасці, дэмакратычнасці.

Мультымедыйнасць сучаснай інфармацыйнай прасторы абумовіла некаторыя асаблівасці, якія вызначаюць характар міжнароднага вяшчання: 1) пераход да розных платформ дыстрыбуцыі кантэнту; 2) больш вузкі і дэтэрмінаваны фокус вяшчання; 3) магчымасць трансліраваць кантэнт на міжнародную аўдыторыю без значных выдаткаў на тэхнічную арганізацыю, што дазваляе аператыўна адаптоўваць дзейнасць медыя ў адпаведнасці з актуальнымі задачамі; 4) інтэнсіўнае развіццё і пашырэнне геаграфіі дзейнасці замежных вяшчальнікаў [2, 9, 10, 12, 19, 23, 25, 26, 32, 35].

2. Інтэрпрэтацыя знешняй інфармацыйнай дзейнасці дзяржавы залежыць ад агульнага ідэалагічнага і палітычнага кантэксту, што адлюстроўваецца ў навуковых працах. Міжнароднае вяшчанне за гісторыю свайго існавання прайшло два ключавыя этапы. Першапачаткова яно мела дакладна акрэсленую прапагандысцкую

тактыку, скіраваную на дыскрэдытацыю палітычнага апанента. Тэхналогія радыёвяшчання на кароткіх, сярэдніх і доўгіх хвалях, выпрацаваная і ўкаранёная ў гэты перыяд, упершыню дазволіла ўплываць на фарміраванне іміджу дзяржавы праз інфармацыйную прастору за мяжой. Інфармацыйнае ўмяшальніцтва прадугледжвала выкарыстанне інвектыўна-маніпулятыўных спосабаў інтэрпрэтацыі рэчаіснасці, што было характэрнай рысай медыяпрадукту, які ствараўся рознымі бакамі міжнароднага супрацьстаяння. Навуковае асэнсаванне гэтай з’явы ў часы «халоднай вайны» характарызуецца дакладна акрэсленым прадметам даследавання – спосабы і метады прапаганды, ступень эфектыўнасці ад умяшальніцтва ў інфармацыйнае поле іншых дзяржаў.

Апошнія тры дзесяцігоддзі з’ява міжнароднага вяшчання вывучаецца як шматаспектны працэс, вынікам якога становіцца медыяпрадукт з дакладна вызначанай камунікатыўнай мэтай. Распад СССР і фарміраванне шматпалярнага свету трансфармавалі аднабаковы пасыл сродкаў масавай інфармацыі ў сеткавую камунікацыю, для якой характэрна ўраўнаважанае ўзаемадзеянне такіх кампанентаў, як структура камунікатыўнага працэсу, каналы распаўсюджвання інфармацыі, уласна паведамленне. Такім чынам, знешнепалітычная прапаганда ператварылася ў сродак публічнай дыпламатыі, які канцэптуалізуецца праз выкарыстанне такога інструмента ўзаемадзеяння, як «мяккая сіла», і паступальную пабудову дыялагічнай камунікацыі. Падобныя пераўтварэнні сталі прычынай працэсу трансфармацыі замежнага вяшчання ў міжнароднае, што дэманструе сціранне дзяржаўных межаў і стварэнне мэтавай аўдыторыі з улікам шэрагу крытэрыяў (месца пражывання, мова камунікацыі, сфера дзейнасці, асабістыя інтарэсы і інш.). Мэтай міжнароднага вяшчання стала фарміраванне пазітыўнага медыявобраза – фрэйміраванай мадэлі адлюстравання рэчаіснасці, праз якую чалавек усведамляе і засвойвае інфармацыю паводле падзеі, інтэрв’ю, навіны, выказвання, каментарыя, што ў сукупнасці фарміруе ўяўленне пра тую ці іншую краіну і ўваходзіць у шырокі сацыяльны кантэкст. Такім чынам, мэта міжнароднага вяшчання, аб’ект якога – дзяржава са шматлікімі ўнутранымі сувязямі, канцэптуалізуецца на глабальным узроўні. Якасная трансфармацыя медыякантэнту ў міжнародным радыё- і тэлеэфіры адлюстроўваецца ў рознабаковым навуковым асэнсаванні гэтай з’явы, што закранае як вывучэнне самога кантэнту, так і метады прасоўвання медыявобраза краіны, асаблівасці яго фарміравання ў залежнасці ад менталітэту народа, гістарычных асаблівасцей як краіны-вяшчальніка, так і краіны-рэцыпіента. Адпаведна, у эфіры любы тэматычны кірунак, тэма, праграма, інфармацыйны сюжэт працуе найперш на станоўчае ўспрыманне краіны, рэалізуе рэпрэзентатыўную функцыю [2, 9, 11, 21, 22, 28].

3. Беларуская мадэль фарміравання вобраза краіны ў аўдыявізуальных медыя ўключае ў сябе два ключавыя суб’екты – структурныя падраздзяленні

Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь: радыё «Беларусь» і спадарожнікавы тэлеканал «Беларусь 24», функцыянаванне якіх можна падзяліць на некалькі перыядаў.

Стварэнне радыё «Беларусь» у 1962 г. адбылося ва ўмовах ідэалагічнага супрацьстаяння паміж Усходам і Захадам. У гэты, савецкі, перыяд (1962–1985 гг.) работа беларускай рэдакцыі каардынавалася праз цэнтральнае бюро ў Маскве, дзе і вызначаўся змест кантэнту для замежнай аўдыторыі. Пераходны перыяд (1986–1996 гг.) характарызуецца з’яўленнем арыгінальнага беларускага кантэнту, які закранаў розныя аспекты жыццядзейнасці краіны. У перыяд актыўнага ўвядзення новых моў вяшчання (1997–2004 гг.) была сфарміравана вяшчальная сетка з блокамі праграм на палітычную, эканамічную, сацыяльную, культурную тэматыкі, якія гучалі на беларускай, рускай, нямецкай і англійскай мовах. Пашырэнне якаснай і колькаснай прысутнасці Рэспублікі Беларусь у міжнародным радыёэфіры адбывалася ў перыяд павелічэння аб’ёму вяшчання (2005–2012 гг.). У гэты час кантэнт рыхтаваўся на 8 мовах і распаўсюджваўся праз вяшчанне на кароткіх хвалях, у FM-дыяпазоне і праз інтэрнэт. На сучасным этапе (мультымедыйны перыяд) выбраная кантэнт-стратэгія рэалізуецца на 9 мовах як традыцыйным спосабам (FM-вяшчанне), так і праз інтэрнэт.

Стварэнне міжнароднага беларускага тэлеканала заняло больш за 10 гадоў (падрыхтоўчы перыяд, 1993–2004 гг.), калі вырашаліся тэхнічныя, фінансавыя і юрыдычныя пытанні. У першы вяшчальны сезон тэлеканала «Беларусь-ТБ» (пілотны перыяд, 2004–2005 гг.) была праведзена рознабаковая праца, скіраваная на папулярызацыю і прасоўванне медыя пераважна ў краінах СНД, удакладненне характарыстык мэтавай аўдыторыі і вызначэнне глядацкіх рэйтынгаў. У перыяд актыўнай вытворчасці арыгінальнага (уласнага) кантэнту (2006–2012 гг.) у эфіры тэлеканала «Беларусь-ТБ» з’явіліся аўтарскія праекты, скіраваныя на міжнародную мэтавую аўдыторыю. Пачаткам сучаснага, мультымедыйнага перыяду (з 2013 г.) стаў рэбрэндынг тэлеканалаў Белтэлерадыёкампаніі, у выніку чаго канал «Беларусь-ТБ» трансфармаваўся ў «Беларусь 24». Таксама ў гэты час узрасла інтэнсіўнасць інтэрнэт-прысутнасці беларускага спадарожнікавага тэлеканала, яго кантэнт часткова быў адаптаваны для англамоўнай аўдыторыі, што стала пачаткам яго папулярызацыі па-за арэалам распаўсюджвання рускай мовы [1, 3, 4, 19, 20, 27, 30, 34].

4. Кантэнт-стратэгія міжнароднага вяшчання вызначае спосабы, як выкарыстоўваць кантэнт, каб дасягнуць пастаўленай мэты ў адпаведнасці з запатрабаваннямі замежнай аўдыторыі. Кантэнт міжнароднага вяшчання падпарадкоўваецца шэрагу правіл і законаў сучаснай глабальнай медыясістэмы і выяўляецца ў розных фарматах і праз розныя каналы распаўсюджвання інфармацыі. У інфармацыйных выпусках і тэматычных праграмах радыё «Беларусь»

фарміраванне медыявобраза краіны адбываецца з улікам палітычных, эканамічных, культурных і сацыяльных асаблівасцей канкрэтнага перыяду. Разнастайная тэматыка інфармацыйных выпускаў адлюстроўвае найперш шырокае кола двухбаковых і шматбаковых кантактаў Беларусі з іншымі краінамі. Інфармацыйна-аналітычнае вяшчанне раскрывае сацыяльныя аспекты жыцця беларускага грамадства. Культурнае жыццё нашай краіны прадстаўлена найбольш поўна ў тэматычных праграмах.

Дзейнасць Галоўнай рэдакцыі радыёвяшчання на замежныя краіны (радыё «Беларусь») у пачатку 90-х гг. ХХ ст. адлюстроўвала комплексны і складаны працэс фарміравання незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Матэрыялы замежнага вяшчання, прысвечаныя палітычнаму жыццю краіны ў 1990-я гг., характарызуюцца высокім ўзроўнем крытычнасці і плюралізму. Эфір адлюстроўваў зменлівасць часу, быў насычаны эмацыйнымі, палемічнымі выказваннямі, што праяўлялася праз фрагменты выступленняў дзяржаўных і культурных дзеячаў. У вяшчанні на замежныя краіны гэтага перыяду сталі запатрабаванымі тэмы, якія раней не распрацоўваліся (гендар, рэлігія, эміграцыя, яўрэйскае пытанне), пашырылася геаграфія суразмоўцаў (госці з Заходняй Еўропы і ЗША, этнічныя беларусы-эмігранты), гучалі матэрыялы з далёкага замежжа па выніках шматлікіх камандзіровак супрацоўнікаў рэдакцыі і інтэрв'ю з беларусамі ў эміграцыі. Тэматычны зрэз эфіру выяўляе выразную арыентаванасць на пытанні нацыянальнага станаўлення, пошуку ідэнтычнасці. Гэтыя тэндэнцыі адлюстраваны і ў нямецкамоўных праграмах радыё «Беларусь», якія пачалі выходзіць на пастаяннай аснове з 1985 г. Акрамя інфармацыйнай, ідэалагічнай і адукацыйнай функцый замежнае вяшчанне з Беларусі дзякуючы шырокаму міжнароднаму ахопу выконвала і такую функцыю, як пошук людзей, разлучаных з прычыны Другой сусветнай вайны і «жалезнай заслоны».

На сёння агульная тэматычная скіраванасць міжнароднага радыё грунтуецца на канцэптуалізацыі паняцця *Беларусь*, кожны элемент эфіру, скіраваны на фарміраванне медыявобраза краіны, грунтуецца на align рознабаковых уяўленнях пра нацыянальную ідэнтычнасць. Такім чынам, цэласнасць, вытрыманасць камунікатыўнай мэты арыентуе аўдыторыю на пазітыўнае ўспрыманне інфармацыі, разбурае стэрэатыпы, суадносіць розныя эфірныя кампаненты паміж сабой і стварае завершаную інфармацыйную карціну. Прадуманая тэматыка праграм і ўмелая прэзентацыя беларускай самабытнасці ў міжнародных СМІ можа стаць асновай для фарміравання лаяльнай слухацкай аўдыторыі і ў больш шырокім сэнсе – для наладжвання і развіцця знешнеэканамічных сувязей і кантактаў [1, 3, 7, 15, 16, 17, 24, 29, 31, 33].

5. Камунікатыўная стратэгія міжнароднага эфіру мадэлюе структуру і форму медыятэкстаў, прызначаных для замежнай аўдыторыі. Журналісты радыё

«Беларусь» выкарыстоўваюць вялікую колькасць мікраформ (паводле М. М. Бахціна: навіна, легенда, урок, даведка, рэпліка, рэцэпт, экскурсія, партрэт, парада, канцэрт і інш.) і іх спалучэнняў для разнастайнай і найбольш удалай прэзентацыі інфармацыі. Тым самым праз вяшчанне рэалізуюцца культурнаствaральныя функцыі, якія спрыяюць станоўчаму ўспрыманню краіны замежнай аўдыторыяй. Выяўленне форм прэзентацыі кантэнту дазваляе прасачыць, якім чынам розныя па тэматыцы, хранаметражы, удзельніках радыёпаведамленні адлюстроўваюць універсальныя культурныя канцэпты. На маўленчым узроўні гэта адбываецца з дапамогай лексічных і марфолага-сінтаксічных рэсурсаў. Найбольш эфектыўна трансліраваць пазамаўленчую мэту ў эфіры дазваляе кампазіцыйная арганізацыя радыёмаўлення, дзе выкарыстоўваюцца розныя формы цытавання, кантэкстнага параўнання, аргументацыі і інш. Стварэнне станоўчага вобраза краіны з дапамогай моўных сродкаў з’яўляецца комплексным і шматаспектным працэсам, які ў значнай ступені ўплывае на паспяховасць і запатрабаванасць медыя [1, 5, 6, 8, 13, 14, 17, 18].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Прадстаўленыя вынікі могуць выкарыстоўвацца ў далейшых даследаваннях творчай і арганізацыйнай практыкі рэдакцый СМІ, якія спецыялізуюцца на замежнай аўдыторыі; у вытворчай дзейнасці міжнароднага радыё «Беларусь», спадарожнікавага тэлеканала «Беларусь 24» для павышэння эфектыўнасці рэалізацыі камунікатыўнай мэты; у вучэбным працэсе ў сферы медыя і камунікацыі пры выкладанні адпаведных дысцыплін. Апублікаваныя вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў якасці метадычных рэкамендацый для рэдакцыйнай і вучэбнай практыкі. Уведзеныя ў навуковы дыскурс архіўныя матэрыялы ўяўляюць значнасць для гісторыі айчыннай журналістыкі.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

*Артыкулы ў рэцэнзаваных навуковых выданнях, адпаведных патрабаванням Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь (філалагічныя навукі)*

1. Пяткевіч, В. Беларусь на хвалях Сусвету. Міжнароднае вяшчанне: наша краіна ў эфіры радыё «Беларусь» / В. Пяткевіч // Род. слова. – 2016. – № 3. – С. 32–34.

2. Пяткевіч, В. М. Медыявобраз краіны ў міжнародным вяшчанні: змест паняцця і стратэгіі фарміравання / В. М. Пяткевіч // Журн. Белорус. гос. ун-та. Журналистика. Педагогика. – 2018. – № 1. – С. 56–62.

3. Пяткевіч, В. Беларускі «голас» у замежным радыёэфіры. Як ствараўся медыявобраз дзяржавы ў перыяд станаўлення незалежнасці (90-я гг. XX ст.) /

В. Пяткевіч // Род. слова. – 2019. – № 5. – С. 41–43.

4. Пяткевіч, В. М. Тэлефармат міжнароднага медыявобраза Рэспублікі Беларусь / В. М. Пяткевіч // Тр. БГТУ. Сер. 4. Принт- и медиатехнологии. – 2020. – № 1. – С. 37–40.

*Артыкулы ў зборніках навуковых прац*

5. Пяткевіч, В. М. Стварэнне пазітыўнага медыявобразу краіны на кампазіцыйным узроўні журналісцкага тэксту (на прыкладзе радыё «Беларусь») / В. М. Пяткевіч // Сб. науч. ст. студентов, магистрантов, аспирантов / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2014. – Вып. 11, т. 1. – С. 84–87.

6. Петкевич, В. М. Речевые стратегии формирования медиаобраза страны (на примере контента международного радио «Беларусь») / В. М. Петкевич // Современная медиасреда: творчество и технологии. Взгляд молодых исследователей : межвуз. сб. науч. работ студентов и аспирантов / С.-Петерб. гос. ун-т, Ин-т «Высш. шк. журналистики и массовых коммуникаций». – СПб., 2014. – Вып. 14. – С. 100–107.

7. Пяткевіч, В. М. Тэматычны профіль міжнароднага радыёвяшчання Рэспублікі Беларусь / В. М. Пяткевіч, Г. І. Басава // Сб. науч. работ студентов Респ. Беларусь «НИРС 2014» / Белорус. гос. ун-т. – Мінск, 2015. – С. 424–425.

8. Пяткевіч, В. М. Жанравая разнастайнасць як спосаб рэалізацыі культурнастваральных функцый у эфіры міжнароднага радыё «Беларусь» / В. М. Пяткевіч // Сб. науч. ст. студентов, магистрантов, аспирантов / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2015. – Вып. 13, Т. 2. – С. 318–320.

9. Пяткевіч, В. М. Трансфармацыя тэхналогій міжнароднага вяшчання ва ўмовах сучаснага камунікацыйнага асяроддзя / В. М. Пяткевіч // Журналістыка ў суладдзі з жыццём: да 90-годдзя заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь, д. філал. н., праф. Б. В. Стральцова : зб. навук. прац / пад агул. рэд. канд. філал. навук дацэнта В.П. Вараб'ёва. – Мінск, 2016. – С. 164–168.

10. Пяткевіч, В. М. Стратэгіі фарміравання міжнароднага медыявобраза краіны / В. М. Пяткевіч, Г. І. Басава // Сборник научных работ студентов Республики Беларусь «НИРС 2015» : [сб. ст. лауреатов и авт. работ первой категории XXII Респ. конкурса науч. работ студентов 2015 г.] / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В. А. Богуш (пред.) [и др.]. – Минск, 2016. – С. 357–360.

11. Пяткевіч, В. Эвалюцыя спосабаў міжнароднага радыёвяшчання / В. Пяткевіч // Міждысцыплінарныя даследаванні : зб. арт. / Магілёўс. ін-т М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь ; пад агул. рэд. С. В. Венідзіктава, В. Д. Выбарнага. – Магілёў, 2017. – С. 216–221.

12. Басава, Г. І. Голас Паднябеснай: фарміраванне медыявобразу краіны ў міжнародным вяшчанні Кітая / Г. І. Басава, В. М. Пяткевіч // Пути Поднебесной : сб.

науч. тр. / Белорус. гос. ун-т, Посольство Кит. Нар. Респ. в Респ. Беларусь, Респ. центр китаеведения «Иероглиф». – Минск, 2017. – Вып. 6, Ч. 1. – С. 304–306.

*Матэрыялы навуковых і навукова-практычных канферэнцый, круглых сталоў*

13. Пяткевіч, В. М. Ацэначнасць у тэкстах міжнароднага радыёвяшчання (на прыкладзе радыё «Беларусь») / В. М. Пяткевіч // Журналістыка–2013: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 15-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 5–6 снежня 2013 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. В. Дубовік [і інш.]. – Мінск, 2013. – С. 32–34.

14. Пяткевіч, В. Спосабы трансляцыі камунікатыўнай мэты журналіста на марфолага-сінтаксічным узроўні (на прыкладзе міжнароднага радыё «Беларусь») / В. Пяткевіч // Журналистика – словесность – культура: взгляд молодых исследователей : материалы Респ. науч.-практ. конф., Брест, 20–21 марта 2014 г. / Брест. гос. ун-т ; ред. кол.: Л. В. Скибицкая [и др.]. – Брест, 2014. – С. 136–139.

15. Петкевич, В. М. Формирование «дизайна страны» в международном радиовещании (на примере Республики Беларусь и Китайской Народной Республики) [Электронный ресурс] / В. М. Петкевич // Материалы Международного молодежного научного форума «ЛОМОНОСОВ–2014» / Моск. гос. ун-т ; редкол.: А. И. Андреев [и др.]. – М., 2014. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – С. 1–3.

16. Пяткевіч, В. М. Нацыянальная ідэнтычнасць як платформа для фарміравання іміджа краіны на міжнароднай арэне / В. М. Пяткевіч // XVI Республиканская научно-методическая конференция молодых ученых : сб. материалов, Брест, 16 мая 2014 г. : в 2 ч. / Брест. гос. ун-т ; редкол.: В. В. Зданович [и др.]. – Брест, 2014. – Ч. 2. – С. 112–113.

17. Пяткевіч, В. М. Фарміраванне іміджу Беларусі сродкамі міжнароднага радыёвяшчання / В. М. Пяткевіч // Сборник работ 71-й научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета, Минск, 18–21 мая 2014 г. : в 3 ч. – Минск, 2014. – Ч. 1. – С. 365–369.

18. Пяткевіч, В. Моўны ўзровень медыяпрэзентацыі краіны ў эфіры міжнароднага радыё «Беларусь» / В. Пяткевіч // Визуально-семантические средства современной медиаиндустрии : материалы Респ. науч.-практ. конф., Минск, 21–22 марта 2015 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: С. В. Дубовик [и др.]. – Мінск, 2015. – С. 132–134.

19. Петкевич, В. М. Медиаобраз страны в эфире международного радиовещания [Электронный ресурс] / В. М. Петкевич // Материалы Международного молодежного научного форума «ЛОМОНОСОВ–2015» / Моск. гос. ун-т ; редкол.: И. А. Алешковский [и др.]. – М., 2015. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM). – С. 1–2.

20. Пяткевіч, В. М. Сучаснае міжнароднае радыёвяшчанне Рэспублікі

Беларусь у глабальнай інфармацыйнай прасторы / В. М. Пяткевіч // Журналістыка–2015: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 17-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 12–13 лістап. 2015 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. В. Дубовік [і інш.]. – Мінск, 2015. – С. 233–236.

21. Пяткевіч, В. М. Эвалюцыя якасных характарыстык міжнароднага радыёвяшчання / В. М. Пяткевіч // Международная журналистика–2016: турбулентность межгосударственных отношений и медиа : материалы V Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 18 февр. 2016 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Т. Н. Дасаева [и др.]. – Минск, 2016. – С. 238–243.

22. Петкевич, В. М. Трансформация технологий международного вещания в современном коммуникационном пространстве / В. М. Петкевич // Медиа в современном мире. Молодые исследователи : материалы 15-й междунар. конф. студентов, магистрантов и аспирантов, 9–11 марта 2016 г. / С.-Петерб. гос. ун-т, Ин-т «Высш. шк. журналистики и массовых коммуникаций» ; редкол.: М. А. Бережная [и др.]. – СПб., 2016. – С. 156–158.

23. Петкевич, В. М. Феномен международного вещания в современном медиапространстве [Электронный ресурс] / В. М. Петкевич // Материалы Международного молодежного научного форума «ЛОМОНОСОВ–2016» / Моск. гос. ун-т ; редкол.: И. А. Алешковский [и др.]. – М., 2016. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM). – С. 1–2.

24. Пяткевіч, В. М. Нацыянальная ідэнтычнасць беларусаў і яе адлюстраванне ў міжнародным вяшчанні / В. М. Пяткевіч // Мова – літаратура – культура : матэрыялы VIII Міжнар. навук. канф., Мінск, 15–16 верас. 2016 г. : да 90-годдзя праф. Л. М. Шакуна : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2016. – Ч. 2. – С. 71–75.

25. Пяткевіч, В. М. Асноўныя падыходы да рэалізацыі рэпрэзентатыўнай функцыі дзяржавы на міжнародным узроўні праз медыя / В. М. Пяткевіч // Журналістыка–2016: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 18-й Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 95-годдзю БДУ, Мінск, 10–11 лістап. 2016 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. В. Дубовік [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 31–34.

26. Пяткевіч, В. М. Міжнародны медыявобраз краіны: стратэгічны падыход у фарміраванні / В. М. Пяткевіч // Международная журналистика–2017: идея интеграции интеграций и медиа : материалы VI Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 16 февр. 2017 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Т. Н. Дасаева [и др.]. – Минск, 2017. – С. 228–236.

27. Петкевич, В. М. Стратегии современного международного телерадиовещания (на примере Республики Беларусь) / В. М. Петкевич // Медиа в современном мире. Молодые исследователи : материалы 16-й междунар. конф. студентов, магистрантов и аспирантов, 15–17 марта 2017 г. / С.-Петерб. гос. ун-т, Ин-т «Высш. шк. журналистики и массовых коммуникаций» ; редкол.:

А. С. Смолярова [и др.]. – СПб., 2017. – С. 577–579.

28. Пяткевіч, В. М. Эвалюцыя спосабаў пазіцыянавання краіны ў глабальнай медыяпрасторы / В. М. Пяткевіч // Сучасная медыясфера. Практыка трансфармацыі, тэарэтычнае асэнсаванне, інстытуцыянальныя перспектывы : матэрыялы I Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 30 сак. 2017 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. В. Дубовік [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 213–218.

29. Пяткевіч, В. М. Медыякантэнт Беларусі ў сістэме сусветнага інфармацыйнага працэсу: сцэнарый дыскурснага аналізу / В. М. Пяткевіч // Медиалингвистика–2017. – Вып. 6 : Язык в координатах массмедиа : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Санкт-Петербург, 2–6 июля 2017 г. / редкол.: И. В. Анненкова [и др.]. – С. 84–86.

30. Пяткевіч, В. М. Беларуская мадэль міжнароднага тэлерадыёвяшчання / В. М. Пяткевіч // Журналістыка–2017: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 19-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 16–17 лістап. 2017 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. В. Дубовік [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 20–23.

31. Пяткевіч, В. Кантэнт міжнароднага вяшчання: маўленчыя ўзроўні аналізу / В. Пяткевіч // Профессиональная коммуникативная личность в институциональных дискурсах : тез. докл. междунар. круглого стола, Минск, 22–23 марта 2018 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: О. В. Лущинская [и др.]. – Минск, 2018. – С. 72–73.

32. Пяткевіч, В. Медыявобраз краіны: змест паняцця / В. Пяткевіч // Журналістыка–2018: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 20-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 15–16 лістап. 2018 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. М. Самусевіч [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 43–46.

33. Пяткевіч, В. М. Тэматыка радыёвяшчання на замежныя краіны ў перыяд станаўлення незалежнасці Рэспублікі Беларусь / В. М. Пяткевіч // Аудиовизуальные медиа в условиях трансформации социокультурной среды : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 5 апр. 2019 г. / Белорус. гос. ун-т ; ред. кол.: В. Г. Булацкий [и др.]. – Минск, 2019. – С. 128–133.

34. Петкевич, В. М. Иновещание в период становления независимости Республики Беларусь: особенности организации [Электронный ресурс] / В. М. Петкевич // Материалы Международного молодежного научного форума «ЛОМОНОСОВ–2019» / Моск. гос. ун-т ; редкол.: И. А. Алешковский [и др.]. – М., 2019. – 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM). – С. 1–2.

35. Пяткевіч, В. М. Медыявобраз як вобраз «другой рэальнасці» ў дыгіталізаваным грамадстве / В. М. Пяткевіч // Журналістыка–2019: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 21-й Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 14–15 лістап. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. М. Самусевіч [і інш.]. – Мінск, 2019. – С. 455–458.

## РЭЗЮМЭ

**Пяткевіч Вікторыя Міхайлаўна**

## МІЖНАРОДНАЕ ВЯШЧАННЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: СТРУКТУРА, СТРАТЭГІІ І МЕДЫЙНЫЯ ПРАКТЫКІ

**Ключавыя словы:** міжнароднае вяшчанне, медыявобраз краіны, радыё «Беларусь», тэлеканал «Беларусь 24», кантэнт, тэматычнае поле, нацыянальная ідэнтычнасць, камунікатыўная стратэгія.

**Мэта даследавання** – устанавіць спецыфіку структурных пераўтварэнняў, стратэгій і медыйных практык міжнароднага вяшчання Рэспублікі Беларусь.

**Асноўныя метады даследавання:** апісальны і кампаратыўны метады, экспертныя інтэрв’ю і назіранні, структурна-функцыянальны аналіз, кантэнт-аналіз, дыскурсны аналіз, лінгвастылістычны аналіз.

**Вынікі даследавання і іх навуковая навізна.** Дысертацыя з’яўляецца першым даследаваннем, у якім праведзены комплексны аналіз міжнароднага вяшчання Рэспублікі Беларусь. У ёй прадстаўлены генезіс міжнароднага вяшчання ў Беларусі на аснове вывучэння архіўных матэрыялаў, большасць з якіх уведзены ў навуковы зварот упершыню; вызначаны этапы і асаблівасці развіцця гэтага віду СМІ ў Рэспубліцы Беларусь; у выніку дыскурс-аналізу абгрунтаваны кірункі камунікатыўнай стратэгіі вяшчання; раскрыты працэс эвалюцыі фармату; выпрацаваны тэматычныя прыярытэты беларускага медыякантэнту для міжнароднай аўдыторыі на сучасным этапе.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Прадстаўленыя вынікі могуць выкарыстоўвацца ў далейшых даследаваннях творчай і арганізацыйнай практыкі рэдакцый СМІ, якія спецыялізуюцца на замежнай аўдыторыі; у вытворчай дзейнасці міжнароднага радыё «Беларусь», спадарожнікавага тэлеканала «Беларусь 24» для павышэння эфектыўнасці рэалізацыі камунікатыўнай мэты; у вучэбным працэсе ў сферы медыя і камунікацыі пры выкладанні адпаведных дысцыплін. Апублікаваныя вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў якасці метадычных рэкамендацый для рэдакцыйнай і вучэбнай практык. Уведзеныя ў навуковы дыскурс архіўныя матэрыялы ўяўляюць значнасць для гісторыі айчыннай журналістыкі.

**Галіна выкарыстання атрыманых вынікаў:** навуковая дзейнасць, журналісцкая практыка, адукацыйны працэс.

# РЕЗЮМЕ

**Петкевич Виктория Михайловна**

## МЕЖДУНАРОДНОЕ ВЕЩАНИЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ: СТРУКТУРА, СТРАТЕГИИ И МЕДИЙНЫЕ ПРАКТИКИ

**Ключевые слова:** международное вещание, медиаобраз страны, радио «Беларусь», телеканал «Беларусь 24», контент, тематическое поле, национальная идентичность, коммуникативная стратегия.

**Цель исследования** – установить специфику структурных преобразований, стратегий и медийных практик международного вещания Республики Беларусь.

**Основные методы исследования:** описательный и компаративный методы, экспертные интервью и наблюдения, структурно-функциональный анализ, контент-анализ, дискурсивный анализ, лингвостилистический анализ.

**Результаты исследования и их научная новизна.** Диссертация является первым исследованием, в котором проведен комплексный анализ международного вещания Республики Беларусь. В ней представлен генезис международного вещания в Беларуси на основе изученных архивных материалов, большинство из которых введены в научное обращение впервые; определены этапы и особенности развития данного вида СМИ в Республике Беларусь; в результате дискурс-анализа обоснованы направления коммуникативной стратегии вещания; раскрыт процесс эволюции формата; выработаны тематические приоритеты белорусского медиаконтента для международной аудитории на современном этапе.

**Рекомендации по использованию.** Представленные результаты могут использоваться в дальнейших исследованиях творческой и организационной практики редакций СМИ, специализирующихся на зарубежной аудитории; в производственной деятельности радио «Беларусь», спутникового телеканала «Беларусь 24» для повышения эффективности реализации коммуникативной цели; в учебном процессе в сфере медиа и коммуникации при преподавании соответствующих дисциплин. Опубликованные результаты диссертации могут быть использованы в качестве методических рекомендаций для редакционной и учебной практик. Введенные в научный дискурс архивные материалы представляют значимость для истории отечественной журналистики.

**Область использования полученных результатов:** научная деятельность, журналистская практика, образовательный процесс.

## SUMMARY

**Piatkevich Viktoryia Mikhailauna**

## INTERNATIONAL BROADCASTING OF THE REPUBLIC OF BELARUS: STRUCTURE, STRATEGIES AND MEDIA PRACTICES

**Keywords:** international broadcasting, media image of the country, radio "Belarus", TV channel "Belarus 24", content, thematic field, national identity, communicative strategy.

**Purpose of the research** – to determine the specificity of structural transformations, strategies and media practices of international broadcasting of the Republic of Belarus.

**Basic research methods:** descriptive and comparative methods, expert interviews and observations, structural and functional analysis, content analysis, discourse analysis, linguistic and stylistic analysis.

**Research results and their scientific novelty.** The dissertation is the first research that provides comprehensive analysis of international broadcasting in the Republic of Belarus. The genesis of international broadcasting in Belarus is considered. It is presented on the basis of archival materials, most of which are introduces into the scientific use for the first time. The author defines the stages and characteristics of this type of media in the Republic of Belarus; directions of the communicative strategy of broadcasting are grounded using discourse analysis; the process of evolution of the format is revealed; thematic priorities of the Belarusian media content for the international audience at the present stage are developed.

**Recommendations for the practical use.** The results of the research can be used in further study of creative and organizational practices of media specialized in foreign audience; in the production activities of the radio "Belarus" as well as a satellite TV channel "Belarus 24" to improve the effectiveness of the implementation of the communicative goal; in the educational process in the field of media and communication while teaching relevant disciplines. The published results of the dissertation can be used as methodological recommendations for editorial and educational practices. Archival materials introduced into the scientific discourse are important for the history of the Belarusian journalism.

**Application field:** scientific activity, journalistic practice, educational process.

Подписано в печать 22.10.2020 г. Формат 60x84/16. Бумага офсетная.
Печать офсетная. Усл. печ. л. 1,40. Уч.-изд. л. 1,32.
Тираж 60 экз. Заказ 392.

Республиканское унитарное предприятие «Информационно-вычислительный центр Министерства финансов Республики Беларусь».
Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№2/41 от 29.01.2014.
Ул. Кальварийская, 17, 220004, г. Минск.